23. НИАБ. Ф. 2187, оп.1, д. 15.
24. Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским. Изд. 2-е. – СПб., 1881.
25. Указатель фабрик и заводов Европейской России. Материалы для фабрично-заводской статистики. Изд. 3-е. – СПб., 1894.
26. Список фабрик и заводов Европейской России. – СПб., 1903.
27. Список фабрик и заводов России. – М., СПб., Варшава, 1910.
28. Список фабрик и заводов Российской империи. – СПб., 1912.

**С. Талмачова**

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ СЯЛЯНСКАГА САМАКІРАВАННЯ У ПАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД У МАГІЛЁУСКАЙ ГУБЕРНІ

Рэформа 1861 г. была важным крокам у дэмакратызацыі грамадства тагачаснай Расінскай імперыі. Пасля абвяшчэння Маніфеста 19 лютага 1861 г. аб вызваленні былыя прыгонныя сяляне атрымалі асабістую свабоду і шэраг грамадзянскіх правоу. Яны афіцыйна набылі права самакіравання, якім фактычна валодалі да рэформы 1861 г., дзе важная роля адводзілася сельскаму вобшчаству. Гэта даказвае структура "Агульнага палажэння аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці" ("Агульнае палажэнне") [1]. Сялянскае самакіраванне стаяла у цэнтры рэформы і было адным з інструменау яе правядзення, а таксама з'яулялася гарантам як правоу, так і абавязкау сялян.

"Агульным палажэннем" стваралася двухузроуневая сістэма, па якой сяляне для вырашэння гаспадарчых інтарэсау аб'ядноуваліся у сельскія вобшчаствы, а для бліжэйшага кіравання і суда – у воласці (арт. 17). Сельскае вобшчаства аб'ядноувала сялян, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, у адным ці некалькіх паселішчах. Акрамя таго, рознапамесным сялянам аднаго паселішча ці некалькі маланаселеных дазвалялася аб'ядноувацца ці далучацца да іншых вобшчаствау з іх згоды. Такім чынам, закон прадастауляу сялянам пэуную свабоду самім рэгуляваць структуру сельскага вобшчаства. Адзінай цвёрдай умовай было сумеснае карыстанне зямлёй ці іншымі угоддзямі ці якая-небудзь гаспадарчая карысць. Воласць павінна была перавважна аб'яднаць сельскія вобшчаствы, якія належалі да адной парафіі і уключаць ад 300 да 2000 рэвізскіх душ.

Кіраванне у межах сельскага вобшчаства ускладалася на сход гаспадароу двароу і сельскага старасту, які абірауся на сходзе. У воласці гэта быу валасны сход, які складауся з сельскіх і валасных службовых асоб і выбарных ад кожных 10 дварoу, валасны старшыня з валасным прауленнем і валасны сялянскі суд. Валасны старшыня і валасныя суддзі абіраліся на валасным сходзе, а валаснае прауленне складалася з валаснога старшыні, сельскіх старастау і некаторых іншых выбарных пасад. Такім чынам, фарміраванне валаснога і сельс-



кага кірауніцтва адбывалася на падставе дэмакратычнага пачатку – выбарау. Аднак яны заставаліся пад кантролем міравых пасрэднікау.

У маі–чэрвені 1861 г. у беларускіх губернях у асноуным завяршылася складанне праектау размеркавання паселішчау былых прыватнауласніцкіх сялян па сельскіх вобшчаствах і валасцях [2]. Праекты гэтыя пазней удакладняліся і змяняліся, а у сакавіку–маі 1862 г. губернатары рапартавалі аб заканчэнні размеркавання губерняу на міравыя участкі і валасці [3].

У сувязі з паустаннем 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі па палітычных матывах адбыуся новы падзел паветау на міравыя участкі і воласці. У цыркуляры Віленскага генерал-губернатара ад 2 лютага 1864 г. адзначалася, што пры увядзенні у дзеянне Палажэнняу 19 лютага 1861 г. стварэнне валасцей і сельскіх вобшчаствау аказалася у руках дваранства, якое прытрымлівалася толькі сваіх інтарэсау. Таму у многіх паветах "воласці і сельскія вобшчаствы вельмі дробныя, у іншых размеркаванне сельскіх вобшчаствау па валасцях зусім нязручна для сялян; з гэтых прычын – слабасць і разрозненасць сялянскага грамадскага кіравання; між тым, маючы на увазе цяперашнія палітычныя падзеі. пажадана было б, каб урад меу апору у аднадушным дзеянні больш буйных адміністрацыйных адзінак" [4]. Па загаду М.М.Мурауёва ад 10 кастрычніка 1864 г. дробныя воласці і вобшчаствы аб'ядноуваліся у больш буйныя, якія складаліся не менш як з 1000 рэвізскіх душ, але з адлегласцю паміж паселішчамі і валасным прауленнем не болей 12 вёрст [5]. Памяншалася і колькасць міравых участкау, якія аб'ядноувалі воласці у межах губерняу [6]. Такім чынам, арганізацыя сельскіх вобшчаствау і валасцей ставілася у залежнасць ад палітычных меркаванняу цэнтральных і мясцовых улад, што не ішло на карысць развіццю усведамлення сялянамі неабходнасці стварэння гэтых адміністрацыйных адзінак. Менавіта у гэты час, верагодна, быу пакладзены пачатак працэсу атаясамлівання, з аднаго боку, сельскага вобшчаства з адзінкай сапрауднага самакіравання, а, з другога боку, воласці – толькі з адміністрацыйнай адзінкай. У далейшым гэта прывяло да змяншэння актыунасці большасці сялян пры удзеле у валасных сходах, чым у сельскіх.

Падобныя пераутварэнні валасцей для сялян былі звязаны з дадатковымі выдаткамі на будоулю новых дамоу валасных прауленняу ды інш., аднак рабіліся па загаду Віленскага генерал-губернатара ад 10 верасня 1864 г. "у інтарэсах сялянскай справы" [7; 8, с. 46]. Меркаванні саміх сялян у гэтым выпадку звычайна у разлік не прымаліся. Новае размеркаванне толькі у некаторых выпадках дапускала задавальненне інтарэсау сялян [4; 8, с. 333–334]. У выніку рэалізацыі гэтай пастановы і у наступныя гады колькасць і склад валасцей значна змяняліся.

Імкненне да павелічэння памерау валасцей узнікла і з мэтаю палягчэння назірання царскай адміністрацыі, якой прасцей было назіраць за знешнім парадкам у невялікай колькасці валасцей. Важным было і змяншэнне выдаткау па утрыманню валаснога упраулення. Таму, як уяулялася, уладкаванне такіх ва-

гэтага была і у тым, што сялянскія кабылы былі беларускай пароды, маларослымі і нядужымі. Злучка з ардэнамі часта прыводзіла да гібелі матак, і звычайна не паляпшала мясцовую пароду коней.

У сваю чаргу, у вобшчаствах з малой колькасцю насельніцтва цяжкасці сустракаліся пры выбары кандыдатау на пасаду старасты і старшыні, у прызначэнні жалавання службовым асобам, вельмі цяжкіх выдаткау па адбыццю фурманачнай павіннасці і утрыманню валасных праўленняу, у залішняй перапісцы валаснога праулення і справаздачнасці і г.д. [13].

У першыя гады пасля паустання 1863–1864 гг. колькасць валасцей у краі скарацілася з 921 да 755 (у сярэднім на 18%). У Магілёускай жа губерні колькасць валасцей павялічылася на 3,2% – з 188 у 1864 г. да 194 у 1868 г.[14]. Да 1891 г. колькасць валасцей у цэлым у Беларусі скарацілася амаль на чвэрць (на 25,8 %), у Магілёускай губ., у параўнанні з 1864 г., – на 22,9% і склала 145 валасцей. Адначасова колькасць сялянства за гэты ж перыяд павялічылася па Беларусі з 2565,5 тыс. чал. (у 1866 г.) да 4962,5 тыс. чал. (у 1897 г.) – амаль на 51,7% [15, с. 42]. Такім чынам, люднасць валасцей павялічвалася, але гэта не прыводзіла да утварэння новых валасцей.

Увогуле люднасць валасцей у цэлым па 5 беларускіх губернях узрасла у сярэднім з 4802 у 1881 г. да 5468 чал. абодвух полау у воласці у 1891 г. (на 12,2%). Найменшы рост назірауся у Віленскай губ. – адпаведна з 5121 да 5221 чал. (на 1,9%), а найбольшы – у Магілёускай губ. – з 6087 да 7076 чалавек у воласці (на 14,0%). У астатніх губернях колькасць насельніцтва ў воласці узрасла на 10–12% [14].

Звяртае на сябе увагу значнае адрозненне у лічбах, што адлюстроуваюць люднасць валасцей. У 1881 г. у сярэднім па пяці заходніх губернях яна складала 4802 чал. у воласці, а у Магілёускай – 6087 чал. Гэтая ж тэндэнцыя захавалася і да 1891 г.: Магілёускай губ. жыло у сярэднім па 7076 чал. у воласці, а па губернях – у сярэднім 5468 чал. у воласці [14].

Разам са зменамі у колькасці валасцей змяняуся і іх склад. Сельскія вобшчаствы таксама аб'ядноуваліся у больш буйныя. У кожным сельскім вобшчастве Магілёускай губ. у 1881 г. налічвалася у сярэднім па 456 чал., а у 1891 г. – 538 чал., а у сярэднім па Беларусі – адпаведна 589 і 601 чал. у вобшчастве.

З 1864 па 1891 г. колькасць сельскіх вобшчаствау скарацілася ў 5 заходніх губернях на 17,9% (з 7570 вобшчаствау да 6212), у Магілёускай губ. – з 2209 да 1907 (на 13,7%). Акрамя таго, змянялася і колькасць сельскіх вобшчаствау у валасцях. У Магілёускай губ. у 1864 г. у склад адной воласці уваходзіла у сярэднім каля 11,8, а у 1891 – 13,2 вобшчаствы (павелічэнне на 11,9%). Увогуле ў 5 заходніх губернях колькасць сельскіх вобшчаствау у воласці павялічылася у сярэднім з 11,8 да 13,2 (на 11,0%), што адлюстроувае тэндэнцыю да аб'яднання сельскіх вобшчаствау у больш буйныя адміністрацыйныя адзінкі [14].

Трэба дадаць, што на валаснои тэрыторыі жылі не толькі сяляне, прыпісаныя да яе складу. У 70-я гг. XIX ст. па 5 заходніх губернях да воласці было прыпісана 80,7 % ад усяго насельніцтва, якое жыло на яе тэрыторыі – 1545616 чал. з 1915870 чал. Гэтыя паказчыкі у губернскім разрэзе вагаліся ад 76,6% у Мінскай губ. да 83,8% у Гродзенскай і Магілёускай губернях .

Такім чынам, пры роуным размеркаванні земскіх падаткау і павіннасцей на усе насельніцтва, што пражывала на тэрыторыі воласці, беларускія сяляне плацілі б іх амаль на 20% менш. Трэба дадаць, што многія валасныя прауленні знаходзіліся у мястэчках і гарадах, жыхары якіх па шматлікіх пытаннях звярталіся да органау сялянскага самакіравання. Адначасова сяляне не мелі магчымасці уздзейнічаць на не прынісанае да воласці насельніцтва. Шматлікае насельніцтва іншых саслоуяу не плаціла мірскіх зборау, не несла цяжару натуральных павіннасцей, але карысталася тым, за утрыманне чаго плацілі сяляне. У земскіх губернях выдаткі на утрыманне паліцыі, духавенства, пошты, дарог, народных вучылішчау, медыцыны ды інш. спаганяліся з усіх саслоуяу адносна раўнамерна, а у Пауночна-Заходнім краі, дзе земствы адсутнічалі, увесь цяжар земскіх і мірскіх павіннасцей ускладауся на сялян. Прагрэсіуная інтэлігенцыя прапаноувала ідэю усесаслоунай воласці, аднак яна не была падтрымана урадавымі коламі.

Такім чынам, у створанай у парэформенны перыяд структуры сялянскага самакіравання у Беларусі знайшлі сваё увасабленне як традыцыйныя формы арганізацыі сялянскага жыцця (сельскія вобшчаствы), так і новыя (воласці), якія адлюстравалі імкненне царскіх уладау забяспечыць над імі дзейсны адміністрацыйны кантроль пры мінімальных фінансавых затратах. У гэтым накірунку праводзіліся і усе рэарганізацыі сялянскага самакіравання у другой палове XIX ст.

**Літаратура:**


1. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). 2-е собр. – Т. XXXVI. 1861. – СПб.: Гос. тип., 1863. № 36657.
2. Нацыянальны гістарычны архіу Беларусі (НГАБ), г. Мінск, ф. 242, вон. 1, спр. 96, л. 1–3.
3. Расіискі дзяржауны гістарычны архіу (РДГА) у Санкт-Пецярбургу. ф. 1291, воп. 36, 1861 г., спр. 94, л. 24, 77, 90, 97, 121.
4. НГАБ, воп. 1, спр. 198, л. 6.
5. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 417, л. 6; Миловидов А. К 50-летию освобождения крестьян Северо-Западного края. – Вильна, 1911. С. 46; Виленский календарь на 1903 год. Вильна, 1903. С. 232.
6. НГАБ, воп. 1, спр. 415, л. 33–33 зв.
7. РДГА, 1291, воп. 36, 1862 г., спр. 67, л. 186 зв.
8. Сборник распоряжений графа М.Н.Муравьева по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863–1864. – Вильна, 1866.
9. НГАБ, воп. 1, спр. 197, л. 10–10 зв.
10. НГАБ, воп. 1, спр. 13, л. 57–58.
11. НГАБ, воп. 1, спр. 643, л. 30; спр. 2568, л. 28.
12. Бібліятэка РДГА, воп. 1 (Справаздачы губернатарау), спр. 123.

13. НГАБ, воп. 1, спр. 2568, л. 78–79, 102, 209 зв.; Свод заключений губернск совещаний по вопросам, относящимся к пересмотру законодательства о крестья нах: В 3-х т. – СПб., 1897. – Т. I. С. 14, 19–23.

14. Волости и важнейшие селения Европейской России. Вып. V. Губернии Ли товской и Белорусской областей. – СПб., 1895. № 38. Мирские расходы и доходы крестьян за 1891 г. в 50-ти губерниях Европейской России. –С. 32, 34, 38, 44, 46 Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. – Вильна, 1868. С. 245–282; Памятная книжка Могилевской губ. на 1863 г. – Могилев, 1863. – С. 122-236; Список волостей и гмин Европейской России с распределением по призыв ным участкам для отбывания воинской повинности по сведениям к 1 января 1875 г. /Под ред. М.Раевского и М.Мусницкого. – СПб., 1875. С. 8–15, 47–50, 88–96; Ста тистический временник Российской империи. Сер. III. Вып. 13. Мирские расходы крестьян в 46 губерниях Российской империи за 1881 год /Разработано Охочин ским П. – СПб., 1886. С. 23–30, 57–61, 95–103.

15. Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. – Мн., 1990.

**В. Арцёмчык**

# ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ У ВУЧЭБНЫХ КНІГАХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОУ МАГІЛЁВА 1864-1899гг.

*...Сильная, славная,— Русь православ*
*Путь твой начертан Всевышней десниц*
***Будешь над царствами мира царицею***
*С ними не равная,— мощнодержавн*

(Урывак з эпіграфа да геаграфічн
нарысау 90-х гадоу 19ст.)[8]

Другая палова 19ст. перыяд даволі складаны з пункту гледжання грамадс ка-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага жыцця на землях Пауночна-Заходня га краю Расійскай імперыі. Гэта перыяд калі Расія змагла нарэшце падавіць тут даволі моцныя сепаратысцкія настроі польскага і паланфільскага насельніцт ва. Паустанне 1863-64 гадоў было апошнім моцным прапольскім паустаннем на Беларусі. У яго межах вызначылася і беларуская нацыянальная ідэя, адна яна яшчэ крочыла побач з ідэяй польскай незалежнасці. У апошнім "лісце з па шыбініцы" К. Каліноускі як адзін з кіраунікоу паустанцкага руху у Літве і на Беларусі пісау: "Прыймі, народзе, па шчырасці мае слова прадсмертнае, бо яно як з таго света толька для дабра твайго напісана. Нямаш, браткі, большага шчасці на гэтым свеце, як чалавек мае розум і науку. Тагды ён толька магчыме жыць у багацтве, па праудзе... Но як дзень з ноччу не ходзіць разам, так не ідзе разам наука праудзіва з няволяй маскоускай. Дапокуль яна у нас будзе, у нас нічога не



будзе, не будзе прауды, багацтва і н
калі пачуешь, што браты твае з-пад
ды і ты не аставайся ззаду, но ухап
грамадой ідзі ваяваці за сваё чалаве
ва, калі над табою Маскаля ужэ не

Аднак беларусы, у тыя часы—
шасці глухімі да гэтых ідэй. а часам
ля, які у 1861 годзе скасавау прыго
рэформы. На Магілёушчыне боль
кая моладзь.

Паустанне сведчыла аб неабхо
дактрыну у дачыненні да этнасау Б
што ствараус ў працэсе адукацыі
нёускай моладзі у пэуным кірунку.

Зразумела, што неадукаваны ча
насць на бытавым узроуні. Адукац
най сацыяльнай, у тым ліку і этніч
этнасу у асяроддзі іншых, сфарму
палітычнага, сацыяльна-эканамічн
кацыя стварае падмуркі для пашыр
валяе выйсці за межы афіцыйный

А зараз вызначым як адлюстр
да асэнсавання ролі і месца белар
вучэбных кнігах навучальных уста

У 1864 годзе у сталіцы імперы
но-русского края по вероисповеда
незнакомых с русским языком, Си
карта всего западно-русского края,
[1, с.1]. Гэта сведчыла аб тым, ш
вання права на валоданне землямі
тва, але і для замежжа.

Атлас вызначае "три Белорус
Минскую), и Литовско-русские гу
такая этнічная група як беларусы
жителей в 9 западных губерниях
ских 67,2%, евреев 11,07%, поляк
шей 1,75%, молдаван 0,39%, немц
відавочна імкненне атаясамляць
рускім этнасам, тым больш, што
вызнанню. "Православных 62,56
рядцев 0,98%, протестантов 0,62%
што стараверы не вызначаны на к